Асіповіцкі КРАЙ

# Александр Богданович на приёме в Осиповичах выслушал проблемы земляков

***Опубликовано: Асіповіцкі Край***

*Понедельник, 26.03.2018 10:08. Рубрика: Улада  Tags: власть, депутат*

**Чарговы прыём жыхароў Асіповіччыны дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Аляксандр Баргдановіч правёў у прысутнасці старшыні раённага Савета дэпутатаў Сяргея Сувеева. Такое ўзаемадзеянне прадстаўнікоў рознаўзроўневых органаў прадстаўнічай улады ў зносінах з землякамі безумоўна можа быць плённым — асабліва ў вырашэнні важных праблем рэгіёна.**



З сямі зваротаў, якія прагучалі падчас прыёму, два мелі адносіны да грамадскіх ініцыятыў мясцовай супольнасці. Гэта — стварэнне ў горадзе скаладрому, прыдатнага для сур'ёзных заняткаў альпінізмам, і праграма адраджэння сваёй малой радзімы, якую распрацавалі і рэалізуюць жыхары вёскі Вялікая Грава.

Астатнія ж тычыліся рознабаковых аспектаў удасканалення заканадаўства ў галіне праваахоўнай дзейнасці, сацыяльнай абароны насельніцтва і работы камунальнай гаспадаркі.

**Фота Дзмітрыя САЎРЫЦКАГА.**